ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 5 (734) ● Пятніца, 14 лютага 1969 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXII





## УНІВЕРСІТЭТ ГАНАРЫЦЦА ІМІ

У мінулую сесію 808 студэнтаў дзённай формы навучання здалі экзамены толькі на выдатна. Прыемна, што атрад выдатнікаў папоўніўся і за лік першакурснікаў. Прыемна таксама, што многія студэнты з году ў год вучацца толькі на пяцёркі. Сярод іх і Юра Шынкар, якога вы бачыце на здымку, студэнт трэцяга курса аддзялення філасофіі гістфака — стыпендыят стыпендыі імя Карла Маркса.

А вось Наташа Шаціла зрабіла толькі першы крок па шляху тых, кім ганарыцца універсітэт, — яна студэнтка першага курса біялагічнага факультэта. Усе тры экзамены — па анатоміі раслін, неарганічнай хіміі і гісторыі КПСС — яна здала на выдатна.

Фота Г. Марозава і М. Нічыпарэнкі.

## ІДЗЁМ ДА ВЫБАРАЎ

Ажыўлена ў гэтыя дні ў агітпункце выбарчага ўчастка № 1 Ленінскага раёна г. Мінска. Біялагічны корпус упрыгожаны маляўнічымі плакатамі і лозунгамі. Тут сардэчна сустракаюць усіх, каму ў хуткім часе давядзецца аддаць свой голас за кандыдатаў у мясцовыя Саветы, запрашаюць на штодзённыя нарады і кансультацыі, сустрэчы і гутаркі са знатнымі людзьмі горада і рэспублікі.

Заўтра а 16-й гадзіне ў клубе біяфака агітпункт арганізоўвае сустрэчу з пісьменнікамі і паэтамі Беларусі — лаўрэатамі Дзяржаўнай прэміі БССР. Той, хто будзе прысутнічаць на гэтай сустрэчы, пачуе цікавыя расказы аб сённяшніх клопатах беларускіх літаратараў, аб іх задумах на будучае, праслухае новыя творы. Пасля заканчэння гутаркі сіламі студэнтаў будзе пастаўлен канцэрт мастацкай самадзейнасці.

А ў нядзелю, 16 лютага, у гэтым жа клубе, таксама а 16-й гадзіне, будзе дэманстравацца кінафільм.

17 лютага з 19 да 21 гадзіны ў агітпункце можна будзе атрымаць юрыдычную кансультацыю.

Цікавая гутарка «Асваенне геалагічных рэсурсаў за гады Савецкай улады» адбудзецца ў чацвер, 20 лютага. З цікавымі паведамленнямі выступяць нашы універсітэцкія вучоныя. А ў суботу выбаршчыкі сустрэнуцца з Героямі Савецкага Саюза, удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны Д. П. Жмуроўскім і А. А. Філімонавым.

І гутарка, і сустрэча адбудуцца ў клубе біялагічнага факультэта а 17-й гадзіне.

## РЭХА ЭКЗАМЕНАЦЫЙНАЙ СЕСІІ

# РАДАСЦІ І ЗАСМУЧЭННІ

Ты паступіў ва універсітэт. Якая гэта радасць! Нарэшце мары твае збыліся. І вось—першая ў жыцці экзаменацыйная сесія. Ты чакаў яе, рыхтаваўся да сустрэчы з ёй, хваляваўся. Як заўсёды, табе не хапала на падрыхтоўку да кожнага экзамена ўсяго толькі аднагоадзінага дня. Ды неўзабаве і гэтыя хваляванні скончыліся. Экзамены ўсе здадзены. Палёгка адчуваецца ўсім целам. Самае галоўнае, што ты цяпер — паўнапраўны студэнт, член дружнага, мэтанакіраванага калектыву.

Такое, ці прыблізна такое адчуванне ў многіх студэнтаў - першакурснікаў філалагічнага факультэта, якія здалі сесію на адны пяцёркі. Гэта—В. Александровіч, А. Цудня, Т. Жук, Г. Каржанеўская, Я. Кавалёў, Р. Молаш, Л. Кулак, Н. Рымарова, Н. Івашына і некаторыя іншыя. Адна чацвёрка ў залікоўцы, хоць гэта і не вельмі прыемна,— таксама невялікая бяда. Летняя сесія дасць магчымасць паправіць вынік. А тое, што Т. Каралёнак, Н. Лайша, В. Адамушка, В. Булыга, Г. Галкіна, Л. Лаўшук могуць займацца толькі на выдатна, у гэтым няма ніякага сумнення. Яны былі актыўнымі на практычных занятках, уважліва слухалі лекцыі, падоўгу сядзелі ў студэнцкіх чытальнях. Што ж, відаць, недзе было недапрацавана, недаседжана. А можа і студэнцкае шчасце падвяло! Не будзем высвятляць прычыну. Уперадзе — новая праца, новыя выпрабаванні...

Зусім дрэнна, калі ў залікоўцы замест назвы прадмета—пустое месца, а ў ведамасці значыцца «нездавальняюча». Гэта зусім дрэнна. Значыць, студэнт паленаваўся, рыхтаваўся мала, працаваў абы-як. На аддзяленні беларускай мовы і літаратуры такіх двоечнікаў набралася сем чалавек, на аддзяленні рускай мовы і літаратуры роўна ў два разы больш. Гэта — Л. Брухан, Е. Вітkоўская, Л. Бродкіна, Т. Муская, Г. Голуб, Г. Рыдзеўская, В. Трус і іншыя. М. Раманаў і Н. Давыдава маюць па дзве двойкі, а Я. Камароўская паспела атрымаць ажно тры. Вынікі надта несуцяшальныя для саміх студэнтаў, для груп і курсаў, гэта тым больш прыкра, што ў цэлым філолагі-першакурснікі здалі сесію нядрэнна. Так, павышаную стыпендыю будуць атрымліваць 12 студэнтаў беларускага і 5—рускага аддзяленняў, якія атрымалі пяцёркі па ўсіх прадметах.

**В. РАГОЙША,**
кандыдат філалагічных навук.

# НЕ ПРОСТА СТУДЭНТ, А ДАСЛЕДЧЫК

Фізічны факультэт вядзе шырокую навукова-даследчую работу. На факультэце працуюць праблемная і тры кафедральныя лабараторыі, чатыры даследчыя групы і студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя. У мінулым годзе быў адчувальным не толькі колькасны, але і якасны рост супрацоўнікаў факультэта. Два чалавекі абаранілі доктарскія дысертацыі —Л. А. Барысаглебскі, В. Д. Ткачоў — і 12 чалавек абаранілі кандыдацкія дысертацыі. На кафедрах ядзернай фізікі, радыёфізікі і аптычных кафедрах паспяхова вядзецца падрыхтоўка навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі. У гэтым годзе чакаецца абарона 15 кандыдацкіх дысертацый.

Многа ўвагі было ўдзелена выкананню гаспадарча-дагаворных работ. Сярод кафедр і лабараторый, якія паспяхова спалучалі тэарэтычныя даследаванні з практычнымі распрацоўкамі, варта назваць у першую чаргу кафедры ядзернай фізікі (засвоен аб'ём у 350 тысяч рублёў) сумесна з праблемнай лабараторыяй паўправадніковай тэхнікі, аптычныя кафедры (115 тысяч рублёў), кафедру радыёфізікі (240 тысяч рублёў). Актыўна ўключыліся ў гаспадарча-дагаворныя работы кафедры фізікі паўправаднікоў (50 тысяч рублёў), электрафізікі (45 тысяч рублёў), кафедра электронных матэматычных машын (30 тысяч рублёў) і іншыя.

Актуальнасць тэматыкі, выкананне ўзятых абавязацельстваў былі і застаюцца характэрнымі рысамі у гаспадарча-дагаворнай рабоце, якая праводзіцца кафедрамі.

У гэтым годзе аб'ём дагаворных работ яшчэ больш узрос. Гаспадарча-дагаворныя распрацоўкі знаходзяць прымяненне ў народнай гаспадарцы і служаць базай для далейшага развіцця навукі і навучання студэнтаў, а ў радзе выпадкаў садзейнічаюць падрыхтоўцы дысертацыйных работ.

Удзел студэнтаў у навуковых даследаваннях даў магчымасць прадставіць на рэспубліканскі агляд 38 студэнцкіх навуковых работ. Праўда, удзел кафедр у аглядзе быў неаднолькавы. Кафедра ядзернай фізікі, напрыклад, прадставіла 12 работ, кафедра электронных матэматычных машын—11. У гэтым годзе пададзены 43 работы.

У адказ на пастанову ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па павышэнню эфектыўнасці работы навуковых арганізацый і паскарэнню выкарыстання ў народнай гаспадарцы дасягненняў навукі і тэхнікі» наша партыйная арганізацыя яшчэ на справаздачна-выбарным сходзе вызначыла рад канкрэтных мер. Пашыраецца на факультэце тэхнічная база. Рэкамендавана прыняць за правіла, каб кожны выкладчык і супрацоўнік займаўся хоць бы з адным студэнтам па пытаннях навуковай працы, што ўжо само па сабе прыцягне 10—15 працэнтаў студэнтаў факультэта да навуковых даследаванняў.

Аб студэнцкай навуковай творчасці на факультэце мне хацелася б пагутарыць падрабязна. Шырокія і шматлікія формы студэнцкай навуковай работы. У мінулым годзе на малодшых курсах працавалі два студэнцкія навуковыя гурткі (па тэарэтычнай фізіцы і па квантавых генератарах), а многія студэнты трэціх, чацвёртых курсаў удзельнічалі ў выкананні навуковых і тэматычных, у тым ліку і гаспадарча-дагаворных работ.

(Заканчэнне на 3-й стар.).



Заняткі ў школе юных фізікаў вядзе выкладчык фізфака Р. П. Філітовіч.

Фота Г. Марозава.

# Да 200-годдзя з дня нараджэння І. А. Крылова

**ІМЯ ІВАНА АНДРЭЕВІЧА КРЫЛОВА ДАРАГОЕ КОЖНАМУ ЧАЛАВЕКУ І ЗНАЁМАЕ З ДЗІЦЯЧЫХ ГАДОЎ. НЕ ДЗІЎНА ТАМУ, ШТО ПАМЯЦЬ АБ ВЯЛІКІМ БАЙКАПІСЦУ ЖЫВЕ І ЦЯПЕР, А ЯГО ТВОРЧАСЦЬ НЕ ПЕРАСТАЕ ЗАХАПЛЯЦЬ УСЁ НОВЫЯ ПАКАЛЕННІ.**

**ШЫРОКА АДЗНАЧАЕ НАША КРАІНА 200-ГОДДЗЕ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ПІСЬМЕННІКА. У РЭСПУБЛІКАНСКІХ ВЫДАВЕЦТВАХ ВЫЙШЛІ З ДРУКУ ЗБОРЫ ТВОРАЎ КРЫЛОВА, АСОБНЫЯ ВЫДАННІ ЯГО БАЕК. У БІБЛІЯТЭКАХ, КЛУБАХ, НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОВАХ АДБЫЛІСЯ ЛІТАРАТУРНЫЯ ВЕЧАРЫ, ПАДРЫХТАВАНЫ ЦІКАВЫЯ ВЫСТАЎКІ.**

## КРЫЛОЎ І БЕЛАРУСКАЯ БАЙКА

Эзоп, Федр, Лафантэн, Пільпай... Не такі ўжо вялікі шэраг славутых байкапісцаў. Іван Андрэевіч Крылоў займае ў гэтым шэрагу самае ганаровае месца.

Пісалі ў Расіі байкі і да Крылова. Але толькі Крылову ўдалося ўзвесці рускую байку, па словах В. Р. Бялінскага, да найвышэйшай дасканаласці і сапраўднай народнасці. З жанру ўмоўна-алегарычнага, дыдактычнага ён ператварыў яе ў жанр рэалістычны. Канчаткова і беззваротна! Таму беларуская байка, якая развівалася пасля Крылова ў рэчышчы рэалістычнага напрамку, класіцызму і сумнай дыдактыкі амаль не ведае.

Пачалося з перакладаў. І, дарэчы, першым перакладчыкам Крылова быў Ф. Багушэвіч, а не Марыя Косіч, як гэта памылкова лічылася раней некаторымі даследчыкамі. У Багушэвіцкіх зборніках «Дудка беларуская» (1891), «Смык беларускі» (1894) знаходзім, акрамя «чыста» арыгінальных «сатыр», і байкі, напісаныя паводле крылоўскіх сюжэтаў. Гэта — «Воўк і авечка», «Свіння і жалуды». Крыху пазней «Страказу і мураўя» пераклаў А. Гурыновіч (пад назвай «Казельчык»). Захапляўся Крыловым і А. Абуховіч. На жаль, зберагліся яго толькі «Ваўкалак» і «Старшына» («Мірская сходка» ў Крылова). І толькі ў 1903 годзе ў Чарнігаве з'явілася «Пералажэнне некаторых баек Крылова на беларускую гаворку» М. Косіч. Але пасля Багушэвіча і Абуховіча, пасля паэм «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе» яны выглядалі нават для тагачаснага чытача і крытыка занадта нязграбнымі і бездапаможнымі. Толькі Багушэвіч і Абуховіч у поўнай меры садзейнічалі ўзнікненню і развіццю гэтага жанра ў нашай літаратуры. Крылоўскім байкам яны надавалі нацыянальную беларускую афарбоўку, прыстасоўваючы іх да новых грамадска-палітычных умоў. Але менавіта так, не скоўваючы сябе рамкамі арыгінала, рабіў і Крылоў, перакладаючы Лафантэна і Эзопа.

Уносілі яны і тэхнічныя змены. Скажам, разнастопны верш Крылова перароблен імі ў страфічны, па ўзору народнай сатырычнай песні. Знікла ў іх звычайная крылоўская «мараль».

Склад і рытмы песні і нават з'едлівай, гуллівай прыпеўкі ўдала скарыстоўваў і А. Абуховіч:

Льва-манарха воўк
прасіў,
Каб вайтом яго зрабіў...

Крылоўскую заўвагу аб тым, што авечым старастам прызначылі ваўка без ведама авечак, «а их-то бы всего нужней спросить», Абуховіч яшчэ больш завастрае:

А авечкі што сказалі?
Іх на сход зусім не звалі,
А ўпісана ў пратаколе,
Што авечкам дана воля.

Аўтар меў на ўвазе рэформу 1861 года, і чытачу аб гэтым няцяжка было здагадацца.

Алегорыя, казачная ўмоўнасць арганізуе і байку Абуховіча «Ваўкалак». На прапанову Лыскі служыць пану, гаворыцца ў байцы, ваўкалак адказвае, што лепш быць галодным, затое свабодным:

На свабодзе прападу,
А ў няволю—не пайду!
Буду вольным
ваўкалакам,
Ты ж—на прывязі
сабакам!

Далейшае развіццё і станаўленне беларускай байкі працягваецца ў сатырычных і гумарыстычных творах Купалы, Коласа, Багдановіча, у іх перакладах Крылова. Блізкімі да баек былі многія сатырычныя вершы А. Паўловіча, апавяданні Ш. Ядвігіна («Павук», «Сіло», «Сакатушка»). Зрэдку, але пачалі з'яўляцца крылоўскія байкі на беларускай мове ў «Нашай ніве», у прыватнасці, «Падарожныя і сабакі» ў перакладзе І. Касцевіча. Узоры баечнага жанра знаходзім у М. Багдановіча:

Прыгода гэтая не так
даўно была.
К чыжу (а сілы ён, як
ведама, не мае)
Варона прыступае:
«Скажы, ці я падобна
да арла?»
І бачыць чыж—з воронаю
не жарты,
А ўласны хахалок чагонебудзь ды варты.
(«Варона і чыж»).

Гэта быў ужо спецыфічны баечны верш, з рознай колькасцю складоў у радках, з размоўнымі інтанацыямі і баечным дыялогам. Гэта была ў поўным сэнсе літаратурная байка. М. Багдановіч, акрамя таго, даў і тэарэтычнае абгрунтаванне беларускай байкі. Яно знайшло практычнае замацаванне і далейшае развіццё ў творчасці Купалы і Коласа. Бо і Купала, як і яго папярэднікі, пачынаў з перакладаў і таксама страфічным вершам. Яго пераклад «Лебедзя, Рака і Шчупака» ў многім быў яшчэ вучнёўскім, падрыхтоўчым, а з 1908 па 1914 год ён стварае цэлы шэраг арыгінальных баек, сярод іх — «Асёл і навука», «Мікіта і валы», «Асёл і яго цень» і іншыя. У яго нараджаецца байка-памфлет і да таго ж са спецыфічным баечным вершам («Ігнат і п'яўкі», «Два мужыкі і глушэц»). Купала наблізіўся да літаратурнай традыцыі Крылова і пачаў яе развіваць непасрэдна.

Магутнае ўздзеянне Крылова пераżыў на сабе Я. Колас. «Крылоў доўгія часы быў маім богам, — успамінае пісьменнік. — Поўны зборнік яго баек я вывучыў чуць не напамяць». Узяўшы за ўзор Крылова, будучы паэт і сам напісаў 16 баек, але, на жаль, яны не зберагліся. Пазней Колас, як гэта выявіў даследчык яго творчасці А. Семяновіч, стварыў яшчэ пяць баек. Надрукавана з іх была ў дарэвалюцыйны час толькі адна — «Баба і куры».

Пад уздзеяннем рэвалюцыйнага ўздыму мас Колас стварыў і яшчэ некалькі арыгінальных баек, сярод якіх — «Конь і сабака», «Пан і рэчка», «Мужык і клёпкі», «Дуб і кветкі», «Пастух і авечкі».

Купала, Колас і Багдановіч адыгралі вырашальную ролю ў станаўленні і развіцці баечнага жанра ў беларускай літаратуры. Але самага большага росквіту дасягнуў ён у творчасці К. Крапівы. Крапіву з поўным правам чытачы называюць беларускім Крыловым.

Першай байкай яго быў «Воўк і Ягнюк», па-новаму», у перайманне Крылову. А неўзабаве ён стварае выключна арыгінальныя байкі. У Крапівы яны сапраўды народныя, нацыянальна - самабытныя. Яны прыйшлі з народа і пайшлі ў народ. Многія афарызмы ў яго, таксама як і ў Крылова, сталі крылатымі, пераўтварыліся ў прыказкі і прымаўкі: «Каб сонца засланіць, вушэй асліных мала», «Пад кола, жаба, не падлазь», «Другі баран ні «бэ», ні «мя», а любіць гучнае імя» і іншыя.

Росквіт байкі Крапівы прыпадае на 20—40-я гады. У пасляваенны час, прадаўжаючы яго традыцыі, нямала цікавых і вострых баек напісалі У. Корбан, Э. Валасевіч, М. Скрыпка.

Значнай падзеяй у літаратурным жыцці было выбранае Крылова, выдадзенае пад рэдакцыяй Крапівы. Уступны артыкул да яго напісаў М. Клімовіч. З рэцэнзіямі выступілі Р. Шкраба, Л. Салавей.

Цікавыя думкі аб уплыве Крылова на беларускую літаратуру выказалі ў свой час і М. Ларчанка, Я. Казека, А. Семяновіч, А. Макарэвіч. І ўсё ж гэты ўплыў недастаткова вывучаны, патрабуецца глыбокае і ўсебаковае даследаванне майстэрства беларускіх байкапісцаў.

І. ШПАКОЎСКІ,
выкладчык філалагічнага факультэта.

## САПРАЎДЫ НАРОДНЫ ПІСЬМЕННІК

*В. Бялінскі*



І. А. Крылоў.

## На шляху да ісціны

*Пытанне пра год нараджэння Івана Андрэевіча Крылова неаднаразова выклікала працяглыя і зацятыя спрэчкі. Але ісціна і дагэтуль не ўстаноўлена.*

*У многіх энцыклапедыях і слоўніках пішацца, што Крылоў нарадзіўся ў 1768 або 1769 годзе. А. Дзясніцкі адносіць дату нараджэння пісьменніка нават да 1764 года (гл. «Ученые записки Ленинградского пединститута», Л., 1955, т. 107, стр. 333—341), таму што прыезд будучага байкапісца ў Пецярбург, клопаты па службе ды і ўся яго ранняя творчасць не ствараюць уражання нясмелых дзіцячых крокаў. Даследчык спасылаецца на А. Шалыгіна, які пісаў, што Крылоў адразу ж пасля смерці бацькі ў чэрвені 1778 года перавёўся ў губеранскі магістрат і быў адзначаны як 15-гадовы. Невялікі падлік — і атрымліваецца 1764. Больш таго, у адным з «імянных спісаў» Публічнай бібліятэкі за 1840 год так і сказана: «Іван Андрэеў сын Крылоў. 73 год». Хай сабе з нацяжкай, але ўсё ж такі 1766?*

*С. Н. Бабінцаў настойвае на 1768 годзе. Асноўным яго аргументам з'яўляецца «исповедная запись» маці Крылова, датаваная 1786 годам. У ёй указана, што Івану Андрэевічу ў той час было 18 гадоў. Значыць, 1768? Маці Крылова, даказвае Бабінцаў, не магла схлусіць, бо была выключна рэлігійнай жанчынай.*

*Які ж год? Сталы даследчык усёй творчасці Крылова Н.Н.Сцяпанаў аддае перавагу 1769. У гэтым жа годзе і адзначаецца юбілей Крылова. Аднак перад літаратуразнаўствам усё яшчэ стаіць складаная і сур'ёзная праблема. Вырашэнне яе садзейнічала б яшчэ больш глыбокаму і ўсебаковаму вывучэнню творчасці вялікага байкапісца.*

*В. ГРУЗДЗЕЎ,*
*студэнт другога курса факультэта журналістыкі.*

## ПРЫСВЕЧАНА ЮБІЛЯРУ

**Супрацоўнікі бібліятэкі падрыхтавалі ў галоўным корпусе выстаўку твораў выдатнага рускага байкапісца Івана Андрэевіча Крылова, якая прысвечана 200-гадоваму юбілею з дня яго нараджэння.**

**Шматлікія выданні расказваюць аб творчым шляху І. А. Крылова. Тут і зборнікі твораў, і байкі, якія выходзілі асобнымі выданнямі. Пазнаёміўшыся з выстаўкай, можна даведацца і аб камедыях І. А. Крылова.**

**Аб вялікай папулярнасці байкапісца сведчыць ужо і тое, што шматлікія вобразы з баек І. А. Крылова («Лебедзь, Рак ды Шчупак», «Варона і Лісіца», «Воўк на псарні» і іншыя) выкарыстоўваў у сваіх творах Уладзімір Ільіч Ленін.**

**Значны ўплыў зрабіла творчасць Крылова на літаратуру народаў СССР. Азербайджанскі даследчык Мікаэль Рафілі прысвяціў гэтаму пытанню сваю кнігу «І. А. Крылоў і азербайджанская літаратура». Творчасцю Крылова цікавіліся В. Р. Бялінскі («Байкі І. А. Крылова»), В. А. Жукоўскі («Аб байцы і байках Крылова»). Грунтоўнае даследаванне творчасці Крылова зрабіў прафесар А. В. Западаў.**

**А некалькі год назад выйшла кніга І. Сцяпанава з серыі «Жыццё выдатных людзей» —«Крылоў», якая таксама прадстаўлена на выстаўцы.**

**Л. ШАБАН,**
**студэнтка.**

І. А. Крылоў.

## МАЛПА І АКУЛЯРЫ

На старасці падслепаватай Малпа стала,
А ў той час чутка вандравала,
Што гэта зло нібы рукою зніме з твару,
Калі завесці акуляры.
З паўтузіна мо' іх сабе дастала
І круціць так і сяк,
Да галавы прыцісне, то на хвост наніжа,
То іх панюхае, а то паліжа.
Яны ж — ну аніяк...
«Цьфу, насланнё! — злуе. —
Ды той зусім здурнеў,
Хто мне пра іх напеў.
Бо ім жа грош цана».
І Малпа тут у роспачы здзічэлай
Аб камень так хапіла іх,
Што толькі пыркі заблішчэлі.
На жаль, бывае гэта і ў людзей:
Як не карысна рэч,
Адны заганы знойдзе ліхадзей,
А калі ён яшчэ з высокім санам,
Дык і зусім адкіне прэч.

Пераклад **Я. Янішчыц,**
студэнткі ІІ курса філфака.




## ДЗВЕ БОЧКІ

Дзве бочкі ехалі: адна з віном,
Другая
Пустая.
Што ж, першая, дык ільга без грукату, цішком
Каціцца,
Другая ж з подскакам імчыцца;
І ад яе па бруку грукат — свет няміл,
І слупам пыл;
Хутчэй спяшаецца прахожы стараніцца,
Спалоханы здалёку грукатнёй.
Ды хоць і грукат Бочкі той,
Парожняй, і вялікі,—карысці мала ў ёй.
Хто больш за ўсё крычыць пра ўласную асобу,
Той, ведай, мала робіць,
Старанны ж — больш маўчыць, крычаць яму чаго?
Пра велічнасць гавораць справы за яго.
А сам ён думае сваю цяжкую думу
Без шуму.

Пераклад А. БАЧЫЛЫ.

# ЗІМА—ЧАРАДЗЕЙКА



*Прыгажосць беларускай прыроды натхняе не толькі паэтаў, але і фотамайстроў, і фотааматараў. Дзякуючы ім мы можам зазірнуць у гушчар лесу, палюбавацца чароўнымі пейзажамі.*

*Сёння мы прапануем увазе чытачоў здымкі першакурсніка аддзялення журналістыкі завочнага факультэта А. БРАГІНЦА.*

## ТВОРЧАСЦЬ ЗАВОЧНІКАЎ

### На свята маці пасылаю

Туды, дзе туліцца да гаю
Ля вёскі родная хаціна,
На свята маці пасылаю
Дарункам цёплую хусціну.
Адразу ж зноў перад вачыма
Усплывае родная ўсмешка...
Матуля крышачку спачыла
І сцеле лён рудою сцежкай.
А вось ідзе яна па лузе
Глядзець, як п'е саломка росы.
З ёй павітаўся крыллем бусел,
А веццем—вербы пры дарозе.
Такой матулю ўспамінаю,
А ў сэрцы думку ўсё ж таю:
Няўжо матуля не пазнае
У хустцы нітачку сваю.

### ЧАМУ Ў МЯНЕ ВОЧЫ БЛАКІТНЫЯ?

Зноўку мой сябар прыкідвае,
Чаму ў мяне вочы блакітныя?
І, пэўна, што ён не ведае:
Такімі былі яшчэ дзедавы...
Дзед жа калісьці на Ясельдзе
Лодкай спяшаўся ў ясны дзень,
А неба ў вачах калыхалася,
На зрэнках навек заставалася.
Казалі яшчэ: вечарамі
Мой дзед засынаў з васількамі
На полі, дзе жыта палоскаю
На ветрыку ціха ўспялёсквала.

**М. ПАНАСЮК,**
**студэнт IV курса аддзялення журналістыкі.**





## У СЯБРОЎ-СТУДЭНТАЎ

✦ З году ў год на філалагічным факультэце Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта афармляюцца 50—60 студэнтаў старэйшых курсаў (трэці—чацвёрты) для работы за мяжой у якасці спецыялістаў - перакладчыкаў з англійскай, іспанскай, французскай, італьянскай моў.

Перакладчыкі часцей за ўсё накіроўваюцца ў такія краіны, як Самалі, Алжыр,. Цэйлон, Куба, Эфіопія, Лівія, Індыя, Чылі, ААР, Гвінея, Конга (Браззавіль), Малі і інш.

Акрамя таго, студэнты факультэта абслугоўваюць прафсаюзныя і камсамольскія дэлегацыі, якія выязджаюць за мяжу.

✦ Другі год на гісторыка-прававым факультэце Далёкаўсходняга універсітэта праходзіць атэстацыя студэнтаў. Атэстацыю праводзіць камісія ў складзе прадстаўнікоў дэканата, прафсаюзнага і камсамольскага бюро.

Пры атэстацыі улічваецца не толькі паспяховасць студэнтаў, дысцыплінаванасць, але і яго маральны воблік. Накоплены вопыт дазваляе сцвярджаць, што атэстацыя — карысны пачын у справе выхавання моладзі.

✦ Адсвяткавалі ўступленне ў другое паўстагоддзе два старэйшыя факультэты Маскоўскага вышэйшага тэхнічнага вучылішча імя Баумана — аўтаматызацыі і механізацыі і энергабудавання.

✦ Абмежаваны час не дазваляе вывучыць замежную мову ва ўсёй яе паўнаце, і, як правіла, студэнты дрэнна арыентуюцца ў мастацкай зарубежнай літаратуры і недастаткова добра — у тэхнічнай.

Студэнцкае бюро перакладаў — новая форма арганізацыйнай работы са студэнтамі. Яны створаны на ўсіх факультэтах Мардоўскага універсітэта. Асноўная задача бюро — аказанне дапамогі прафіліруючым кафедрам у перакладзе арыгінальнай навукова-тэхнічнай літаратуры па спецыяльнасці на англійскай, нямецкай і французскай мовах. Бюро ўзначалілі кіраўнікі метадычных аб'яднанняў і вопытныя выкладчыкі. У іх увайшлі лепшыя студэнты першых-другіх курсаў.

Уся работа, напрыклад, з тэхнічнымі тэкстамі накіравана на тое, каб студэнт навучыўся выдзяляць асноўную думку пры чытанні тэхнічнай літаратуры, няхай гэта артыкул або невялікая інфармацыя, каб у яго быў выпрацаван навык рэферыравання і састаўлення анатацый.

СБП некаторых факультэтаў прымаюць актыўны ўдзел у выкананні гаспадарча - дагаворнай работы. Студэнты выконваюць заказы навукова-даследчых інстытутаў і розных прадпрыемстваў.

✦ З мэтай паляпшэння работы грамадскіх арганізацый, іх узаемнай сувязі на адным з пасяджэнняў партыйнага камітэта Ленінградскага політэхнічнага інстытута абмяркоўвалася пытанне аб каардынацыі ў рабоце грамадскіх арганізацый інстытута. Партыйны камітэт прыняў пастанову, у якой былі зацверджаны схема ўзаемасувязі ўсіх грамадскіх арганізацый інстытута і прылажэнне да яе ў выглядзе памяткі, у якой дакладна вызначана ў адпаведнасці з існуючымі статутамі грамадскіх арганізацый канкрэтнае кола абавязкаў дастасоўна да ўмоў інстытута.

✦ Для таго каб дапамагчы камсоргу правільна наладзіць камсамольскую работу ў групе, на курсе, факультэце, а таксама знайсці правільныя формы работы, унесці ў іх нешта сваё, навучыцца размяркоўваць рабочы дзень, умець правільна ацаніць тую ці іншую падзею у краіне або за мяжой, па рашэнню камітэта ВЛКСМ Казанскага універсітэта створана школа камсамольскага актыву. За невялікі тэрмін было ўжо праведзена некалькі заняткаў. Асноўная ўвага ўдзяляецца пытанням ідэйна-палітычнага выхавання і арганізацыйнай работы. Намечаны мерапрыемствы па дастойнай сустрэчы 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна.

*Кнігі твайго выкладчыка, студэнт*

## АРГУМЕНТАВАНА, БАЯВІТА

**Кожная цікавая кніга прыносіць нам радасць. Яшчэ большай становіцца гэта радасць, калі такую кнігу напісаў твой знаёмы, твой выкладчык. І ты з асаблівым пачуццём павагі да аўтара раскрываеш першыя старонкі яго твора.**

**Што датычыцца кнігі «Філасофія сучаснага праваслаўя», якая нядаўна з'явілася на прылаўках кнігарань, то можна з упэўненасцю сказаць: яна прынясе нямала задавальнення ўсім, хто хоць бы ў некаторай ступені цікавіцца гэтай праблемай.**

**Напісана кніга маладым па ўзросту і па сваёй навуковай дзейнасці выкладчыкам нашага універсітэта кандыдатам філасофскіх навук Віктарам Аляксандравічам Молакавым. Навуковае рэдагаванне яе зрабіў доктар філасофскіх навук, прафесар, член-карэспандэнт АН БССР Іван Мікалаевіч Лушчыцкі.**

**У гэтай кнізе даследуюцца актуальныя і малараспрацаваныя праблемы крытыкі філасофіі сучаснага праваслаўя: пытанніанталогіі, гнасеалогіі і сацыялогіі. Важнасць гэтай тэмы абумоўлена многімі фактарамі. Руская праваслаўная царква адной з першых вымушана была функцыяніраваць ва ўмовах новага грамадскага ладу, пры якім царква была аддзелена ад дзяржавы і школа ад царквы. І, нягледзячы на гэта, праваслаўе з'яўляецца самай вялікай з рэлігійных арганізацый. Да гэтай пары, маючы ў наяўнасці шырокую сетку храмаў і малітоўных дамоў, даволі вялікі штат свяшчэннаслужыцеляў і абапіраючыся на значную частку сваіх паслядоўнікаў, яна ўяўляе сабой сур'ёзнага ідэйнага праціўніка камуністычнага светапогляду. Без прыстасавання да змененых умоў праваслаўе не магло б існаваць. Аднак яго артадаксальнасць доўгі час у нас абсалютызавалася і недаацэньвалася прыстасаванне да савецкай рэчаіснасці.**

**З другога боку, у век імклівага развіцця навукі і тэхнікі ва ўмовах нашай краіны праваслаўе, пазбаўленае іншых сфер дзейнасці, усімі сіламі спрабуе утрымаць свой уплыў на веруючых перш за ўсё ў галіне філасофіі і маралі.**

**Менавіта таму ніякая атэістычная прапаганда не можа абыходзіцца без распрацоўкі тэарэтычных пытанняў, без навуковай крытыкі філасофскай асновы рэлігійнага светапогляду, у прыватнасці праваслаўя. В. А. Молакаў якраз ставіць і вырашае цэлы шэраг цікавых пытанняў з гэтай галіны. Яго кніга, да таго ж, выгадна адрозніваецца ад іншых работ па праваслаўю. Ён удала выбраў кірунак і не паўтарае сваіх папярэднікаў.**

**У першай главе—«Праваслаўе і сучаснасць»—аўтар раскрывае сутнасць і сам працэс прыстасавання рускай праваслаўнай царквы. Ён правільна адзначае, што на ідэалогію праваслаўя аказвае свой уплыў не толькі царкоўная традыцыя, але і сацыялістычная рэчаіснасць, навукова-тэхнічны прагрэс. Пры гэтым, зыходзячы з марксісцкіх пазіцый, В. А. Молакаў падкрэслівае аб'ектыўна-суб'ектыўны характар прыстасавання любой рэлігіі. І несумненнай вартасцю гэтай главы з'яўляецца тое, што у ёй спецыяльна разглядаюцца асаблівасці рэлігійнага прыстасавання ў СССР у розных аспектах. Гэтае пытанне па сутнасці для нашай атэістычнай літаратуры новае і вельмі навуковае.**

**У другой главе — «Праваслаўе аб веры і ведах» выкладзены прынцыпы праваслаўнага багаслоўя ў іх гістарычным развіцці і дадзена ім марксісцкая крытыка.**

**Важным і патрэбным пытанням прысвечана і трэцяя глава кнігі — «Праваслаўе аб духу і матэрыі». Тут даволі падрабязна раскрыта сутнасць філасофскіх поглядаў праваслаўных багасловаў, дадзена глыбока аргументаваная крытыка багаслоўскіх доказаў быцця бога, іх вучэння аб бессмяротнасці душы. Віктар Аляксандравіч не адыходзіць ад складаных пытанняў. Ён не толькі дае, напрыклад, крытыку багаслоўскага разумення бессмяротнасці душы, але і супрацьпастаўляе яму марксісцкае вучэнне сапраўднай бессмяротнасці чалавека.**

**Асаблівую цікавасць уяўляе чацвёртая глава кнігі В. А. Молакава—«Сутнасць сацыяльных поглядаў сучаснага праваслаўя». У ёй аўтар паказаў навуковую неабгрунтаванасць рашэння ідэалогіяй праваслаўя такіх важных філасофскіх праблем, як суадносіны неабходнасці і свабоды, грамадства і асобы, навукова-тэхнічнага прагрэсу і духоўнага жыцця грамадства. Вартым у гэтай главе з'яўляецца перш за ўсё тое, што В. А. Молакаў, абапіраючыся ў аналізе сацыялогіі праваслаўя на работы савецкіх філосафаў апошніх год, прыходзіць у шэрагу выпадкаў да новых, пры гэтым правільных вывадаў. Такія яго вывады аб асноўных кірунках сацыяльнага прыстасавання праваслаўнай царквы да новых умоў, а таксама вывад аб тым, што прыстасаванне да камунізма з'яўляецца не чым іншым, як формай барацьбы праваслаўнай ідэалогіі супраць камуністычнага светапогляду.**

**Вартым у кнізе з'яўляецца і тое, што яе аўтарам перапрацавана вялікая багаслоўская і філасофская літаратура. Асноўныя палажэнні кнігі глыбока аргументаваны. Манаграфія вызначаецца глыбокай партыйнасцю, непрымірымасцю да рэлігійнай ідэалогіі.**

**А. КРУГЛОЎ,**
**выкладчык навуковага атэізму.**

Адказны рэдактар М. І. ІОСЬКА.

АТ 06676 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т. 22-07-19. Тыраж 2000 экз. Тыпаграфія выдавецтва «Звязда». Зак. 244.